Падтрымай "Вясну" на PATREON

# Затрыманы старшыня БНФ Рыгор Кастусёў

04.07.2018 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, затрыманні



Рыгор Кастусёў.

Лідэр Партыі БНФ Рыгор Кастусёў быў затрыманы па дарозе ў аэрапорт Менск-2, паведамляе сайт партыі БНФ. Ён збіраўся вылятаць у Варшаву, дзе меўся ўдзельнічаць у пасяджэнні міжнароднай камісіі польскага Сейму. Паплечнікі па партыі ведалі, што з дому выехаў, але ў Варшаве не з'явіўся. Тэлефон палітыка быў адключаны.

Увечары 3 ліпеня намеснік старшыні Партыі БНФ Аляксей Янукевіч паведаміў, што Рыгор Кастусёў знаходзіцца ў ІЧУ Менскага раёну. Затрымалі лідэра БНФ, на думку **Аляксея Янукевіча**, за Курапацкую варту.

> *«Даведаліся, што ён не сеў на самалёт. Мы абзвоньвалі раённыя аддзелы міліцыі, і зусім нядаўна атрымалі інфармацыю, вельмі абмежаваную, што спадар Кастусёў знаходзіцца ў ізалятары часовага ўтрымання Менскага раёна, і што заўтра будзе суд*», – распавёў Аляксей Янукевіч.

Калі і за што будуць судзіць лідэра Партыі БНФ, на дадзены момант дакладна невядома. *«Але відавочна, што калі затрыманне адбылося ў Менскім раёне, то судзіць могуць за ўдзел у акцыі супраць працы забаўляльнага комплексу з рэстарацыяй "Паедзем паямо" у Курапатах»,* – выказаў меркаванне Янукевіч. Паводле яго слоў, Кастусёў апошні час шмат разоў наведваў Курапаты, дзе больш за месяц доўжыцца грамадзянская акцыя пратэсту супраць працы забаўляльнай ўстановы ў месцах масавых расстрэлаў ахвяраў бальшавісцкіх рэпрэсіяў.

Аляксей Янукевіч таксама адзначыў, што пасяджэнне камісіі польскага сейма, у якім планаваў удзельнічаць Кастусёў, не з'яўляецца экстраным: *«Такія сустрэчы праходзяць рэгулярна, на іх абмяркоўваецца сітуацыя ў Беларусі. Але гэта досыць важнае мерапрыемства, на якім можна выказаць*

*польскай палітычнай супольнасьці нашую пазіцыю і расставіць акцэнты»,* – дадаў намеснік старшыні Партыі БНФ.

На думку Аляксея Янукевіча, судовы працэс па справе старшыні Партыі БНФ Рыгора Кастусёва адбудзецца ў сераду **4 ліпеня ў судзе Менскага раёна (**г.Менск, вул. Маякоўскага, 119А).

Твитнуть









Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

## ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску









## АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

## Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



# Рэферэндум 2022







## ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

## СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh



















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY